Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Гомелі пасля санкцыянаванага мітынгу былі затрыманыя журналісткі і палітычны актывіст дапоўнена

01.05.2017 **Тэгі**: свабода слова, свабода мірных сходаў, затрыманні



Журналістка Ларыса Шчыракова. Фота: Марына Драбышэўская

Журналісткі Марына Драбышэўская і Ларыса Шчыракова, якія супрацоўнічаюць з Белсатам, былі затрыманыя ў Гомелі пасля санкцыянаванага мітынгу 1 траўня. Падставы затрымання ім не тлумачылі.

Яшчэ раніцай **Марына Драбышэўская** паведамляла пра тое, што за яе кватэрай вялося вонкавае назіранне, аднак ёй удалося пазбегнуць затрымання. На мітынгу журналістка вяла стрым.

> *«Мы ішлі разам пасля мітынгу,* – кажа адзін з удзельнікаў акцыі Андрэй. – *Марына меркавала, што яе могуць затрымаць. За кінатэатрам "Юбілейны" да нас пад'ехаў міліцэйскі УАЗік, адтуль выйшлі два супрацоўніки. Адзін з іх прадставіўся як старэйшы лейтэнант Шуляк і запрасіў Марыну праехаць з імі».*

Падставу для затрымання Драбышэўскай не патлумачылі. Зараз журналістка знаходзіцца ў Чыгуначным РАУСе.

Ларыса Шчыракова, якая таксама вяла стрым на акцыі, у інтэрв'ю Белсату паведаміла, што, калі ўжо сыходзіла з мітынгу, да яе пад'ехала міліцэйская машына, адтуль выскачылі два супрацоўнікі і зацягнулі яе ў аўто. Падчас затрымання супрацоўнікі міліцыі не прадставіліся і нічога не патлумачылі Шчыраковай.

Журналістка правяла больш за гадзіну ў Чыгуначным РАУСе, дзе на яе быў складзены пратакол па арт. 22.9 КаАП «Парушэнне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі».

Таксама інтэрнэт-выданне naviny.by паведамляе, што пасля мітынгу быў затрыманы намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Васіль Палякоў**.

Нагадаем, што ў нядзелю ў Гомелі быў затрыманы таксама журналіст **Яўген Меркіс**. 2 траўня яго будуць судзіць нібыта за дробнае хуліганства.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Заява аб прызнанні палітвязнямі Аляксея Камароўскага, Іллі Шакірава і Барыса Протасава

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY